# *Вёска Астраў*





***Было гэта даўно, гадоў трыста таму назад. Праязджалі каля нашай вёскі нейкія купцы. Не ведаю чаму, але хацелі гэтыя купцы заехаць да нас. Хацелі заехаць, ды не заехалі, не было дарогі. З аднаго боку да самых хат падыходзіў вялікі лес. Ніхто цераз гэты лес не хадзіў, не ездзіў. З другога боку было вялікае балота. Казалі, што ў гэтым балоце нейкі праезджы ўтапіўся. Пасля таго ніхто не адважваўся цераз балота ехаць.***

***Паглянулі купцы, што дарогі ніякай няма, і сказалі:***

***– Дзіўна вёска. Не вёска, а нейкі астраў.***

***Ад таго часу і называюць нашу вёску Астравам.***